# МЕДЫЙНАЯ КАНЦЭПТАСФЕРА: ДА ВЫЗНАЧЭННЯ ДЭФІНІТЫЎНАГА СТАТУСУ

***М. А. Груздзева***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*mgruzdeva312@gmail.com*

У артыкуле ўводзіцца паняцце «медыйная канцэптасфера», якое трактуецца як падвід нацыянальнай канцэптасферы, што складаецца з медыяканцэптаў і рэпрэзентуе рэчаіснасць у медыядыскурсе з дапамогай тэкстаў сродкаў масавай камунікацыі. Устанаўліваюцца суадносіны паняццяў «канцэптасфера» і «медыйная канцэптасфера», выяўляюцца асаблівасці структуры медыйнай канцэптасферы.

***Ключавыя словы:*** медыядыскурс; кагнітыўная журналістыка; канцэптасфера; медыйная канцэптасфера.

# THE MEDIA CONCEPTOSPHERE: TO THE DETERMINATION OF THE DEFINITIVE STATUS

***M. A. Gruzdeva***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: M. A. Gruzdeva (mgruzdeva312@gmail.com)*

The article introduces the concept of «media conceptosphere», which is interpreted as a subtype of the national conceptosphere, consisting of media concepts and representing reality in media discourse through texts of mass communication. The author establishes relations between the concepts of «conceptosphere» and «media conceptosphere», identifies the features of the structure of the media conceptosphere.

***Key words:*** media discourse; cognitive journalism; conceptosphere; media conceptosphere.

Кагнітыўная журналістыка – галіна медыялогіі, у якой даследуюцца карэляцыі разумова-маўленчай свядомасці суб'екта камунікацыі, інтэрпрэтацыі факта і адлюстравання рэчаіснасці праз медыявытвор-

часць. Паняційны апарат кагнітыўнай журналістыкі фарміруецца на аснове катэгорый кагнітыўнай лінгвістыкі. Таму пры ўвядзенні ў навуковы зварот паняцця «медыйная канцэптасфера» неабходна зважаць на функцыянаванне найважнейшага тэрміна кагнітыўнай лінгвістыкі – «канцэптасфера». Гэты паняцце было ўведзена Д. С. Ліхачовым, канцэптасферу ён вызначыў як сукупнасць канцэптаў нацыі, утвораную ўсімі патэнцыямі канцэптаў носьбітаў мовы, што ўзбагачаецца культурай нацыі, яе фальклорам, літаратурай, навукай, выяўленчым мастацтвам, гістарычным досведам і рэлігіяй [1, с. 5].

Падчас развіцця кагнітыўнай навукі адбывалася пераасэнсаванне тэрміна, яго азначэнне змянялася і дапаўнялася. Да праблемы трактоўкі паняцця «канцэптасфера» звярталіся такія навукоўцы, як В. А. Маслава, З. Д. Папова, І. А. Сцярнін, А. П. Бабушкін, У. І. Карасік, М. Ф. Алефірэнка, І. У. Зыкава і іншыя. Напрыклад, З. Д. Папова і І. А. Сцярнін разглядаюць канцэптасферу як упарадкаваную сукупнасць канцэптаў народа [3, с. 26]. На думку В. А. Маславай, канцэптасфера ўяўляе сабой сістэму думак і ведаў чалавека пра свет, якая адлюстроўвае яго пазнавальны досвед на дамоўным і моўным узроўнях [2, с. 69]. Даследчыкі, якія займаюцца пытаннямі кагнітыўнай лінгвістыкі, прапануюць і такое азначэнне тэрміна «канцэптасфера»: «гэта чыста мысліцельная сфера, якая складаецца з канцэптаў, што існуюць у выглядзе мысліцельных малюнкаў, схем, паняццяў, фрэймаў, сцэнарыў, гештальтаў (больш ці менш складаных комплексных вобразаў навакольнага свету), абстрактных існасцей, і абагульняюць разнастайныя прыкметы навакольнага свету» [4, с. 15]. Як бачым, назіраецца пашырэнне дэфініенса (азначальнага паняцця), які раскрывае змест тэрміна: сукупнасць канцэптаў – сістэма думак і ведаў – мысліцельная сфера. Акрамя таго, у азначэннях выяўляецца траістасць анталогіі канцэптасферы (культура – мова – асоба) [5, с. 36]. У залежнасці ад таго, з якіх пазіцый у даследаванні апісваецца канцэптасфера, адрозніваецца і суб'ект у азначэнні (народ, чалавек і інш.), і яго змест (разглядаюцца ўзроўні існавання канцэптасферы, яе асноўныя адзінкі і інш.). На падставе прац даследчыкаў у галіне кагнітывістыкі мэтазгодным лічым выкарыстанне наступнага азначэння тэрміна «канцэптасфера» – сістэма кагнітыўных адзінак у свядомасці суб'екта камунікацыі, што рэпрэзентуе пэўны фрагмент рэальнасці.

Даследчыкі вылучаюць розныя характарыстыкі канцэптасферы. На наш погляд, асноўнымі варта лічыць множнасць і структураванасць. Множнасць сістэмы кагнітыўных адзінак выяўляецца ў тым,

што ўспрыманне, інтэрпрэтацыя і рэпрэзентацыя аднаго канцэпту суб’ектамі камунікацыі могуць быць рознымі з прычыны неаднолькавага асабістага досведу кожнага, рознага светапогляду, кантэксту і да т. п. Аднак у канцэптасферы ёсць шэраг знакавых кагнітыўных адзінак, якія расшыфроўваюцца носьбітамі мовы прыкладна аднолькава. Гэтыя канцэпты з’яўляюцца структуравальным пачаткам канцэптасферы. Падыходы да выяўлення арганізацыі сістэмы кагнітыўных адзінак адрозніваюцца. Прапануюць палявы (В. А. Маслава), іерархічны (Ю. С. Сцяпанаў), іерархічна-палявы (З. Д. Папова, І. А. Сцярнін) і іншыя прынцыпы пабудовы канцэптасферы. Але факт яе структураванасці не выклікае сумнення.

Адначаюць існаванне розных відаў канцэптасфер: нацыянальнай, індывідуальнай, групавой (прафесійнай, узроставай і да т. п.), мовы, мастацкага твора і інш. Лічым, што аптымальным варыянтам дзялення канцэптасфер на віды з’яўляецца размежаванне нацыянальнай і індывідуальнай. Нацыянальная канцэптасфера ўяўляе цікавасць з пазіцый выяўлення спецыфікі функцыянавання пэўных кагнітыўных адзінак у свядомасці нацыі. Паданалізную медыйную канцэптасферу разглядаем як падвід нацыянальнай.

Медыйная канцэптасфера з’яўляецца адлюстраваннем нацыянальнага досведу ў галіне масавай камунікацыі. Паводле В. М. Самусевіч, «медыйная канцэптасфера сёння, падчас фарміравання інфармацыйнага грамадства, мае вялікі ўплыў на канцэптасферу носьбітаў культуры і здольная не толькі ўплываць на свядомасць чалавека, але і вызначаць моўнаразумовыя паводзіны соцыуму, фарміруючы нацыянальную карціну свету» [6, с. 120].

Прафесійная дзейнасць журналіста па стварэнні тэкстаў і наступнае іх функцыянаванне ў дыскурсе сродкаў масавай камунікацыі (СМК) фарміруюць у свядомасці рэцыпіентаў асобую рэальнасць – медыйную канцэптасферу. Яна складаецца з медыяканцэптаў – сукупнасцей «ментальных характарыстык, эксплікаваных сродкамі масавай камунікацыі і ўкаранёных у сацыяльную памяць грамадства праз спецыфічныя тэкставыя катэгорыі, такія як перыядычнасць, рэгулярнасць, масавасць (тыражнасць), камунікатыўная прызначанасць і калектыўнае аўтарства» [7, с. 51]. Медыйная канцэптасфера ёсць падвід нацыянальнай канцэптасферы, які складаецца з медыяканцэптаў і рэпрэзентуе рэчаіснасць у медыядыскурсе з дапамогай тэкстаў СМК. Адзначым, што медыядыскурс, у якім актуалізуецца медыйная

канцэптасфера, рухомы і множны, у ім знаходзяць адлюстраванне сучасныя тэндэнцыі ў грамадстве і розныя сацыяльныя працэсы. Таму ў медыйнай канцэптасферы пастаянна фіксуюцца медыяканцэпты, якія рэпрэзентуюць актуальныя з’явы, але такія кагнітыўныя адзінкі не заўсёды даўгавечныя. «Жыццёвы цыкл» медыяканцэпту вызначаецца ступенню яго адпаведнасці з нацыянальным менталітэтам. У сувязі з гэтым у структуры медыйнай канцэптасферы ў якасці ядра вылучаем медыяканцэпты, якія адлюстроўваюць тыповыя для носьбітаў мовы ўяўленні пра пэўныя з’явы і ўваходзяць у нацыянальную канцэптасферу як ключавыя канструкты. У прыядзерную зону медыйнай канцэптасферы ўключаем медыяканцэпты, якія таксама з’яўляюцца прататыпнымі, але «не ўключанымі» ў нацыянальную канцэптасферу. Да перыферыі ж медыйнай канцэптасферы адносім менш рэлевантныя для прадстаўнікоў нацыі медыяканцэпты, якія пазбаўлены аб’ёму фонавых ведаў і маюць абмежаваны «жыццёвы цыкл».

Такім чынам, паняцце «медыйная канцэптасфера» можна разглядаць як адно з асноўных у кагнітыўнай журналістыцы. Яно адлюстроўвае складаную структураваную сістэму, што фіксуе досвед суб’ектаў камунікацыі ў медыясферы.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Лихачев Д. С*. Концептосфера русского языка // Известия РАН. Сер. лит. и яз. М., 1993. Т. 52, № 1. С. 3–9.
2. *Маслова В. А*. Когнитивная лингвистика. Минск: ТетраСистема, 2005. 256 с.
3. *Попова З. Д., Стернин И. А*. Когнитивная лингвистика. М.: АСТ: Восток–Запад, 2007. 314 с.
4. *Бабушкин А. П., Стернин И. А.* Когнитивная лингвистика и семасиология. Воронеж : ООО «Ритм», 2018. 229 с.
5. *Зыкова И. В*. Концептосфера культуры и фразеология: Теория и методы лингвокультурологического изучения. М.: Ленанд, 2015. 380 с.
6. *Самусевіч В. М*. Беларускія СМІ ў лагасферы нацыянальнай культуры. Мінск: БДУ, 2012. 163 с.
7. *Груздзева М. А*. Медыяканцэпт як моўная і лінгвакультуралагічная катэгорыя // Роднае слова. 2021. № 5. С. 49–52.